УДК 902/904 (476)

*Касюк Алена*
*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ПОМНІКІ ЖАЛЕЗНАГА ВЕКУ – ЭПОХІ РАННЯГА СЯРЭДНЯВЕЧЧА Ў ВАКОЛІЦАХ ВЁСАК ЛАСІЦК І ВОСТРАЎ ПІНСКАГА РАЁНА ПА ВЫНІКАХ АРХЕАЛАГІЧНЫХ РАЗВЕДАК У 2015 г.

У артыкуле прадстаўлены вынікі археалагічных даследаванняў, якія былі праведзены аўтарам сумесна з А.Ю.Ткачовым у 2015 г. на помніках з матэрыяламі жалезнага веку – эпохі ранняга Сярэднявечча ў ваколіцах вёсак Ласіцк і Востраў на р. Стыр у Пінскім раёне Брэсцкай вобласці. Прыведзена культурна-храналагічная ідэнтыфікацыя выяўленых матэрыялаў.

***Ключавыя словы: археалогія, Пінскі раён, жалезны век, эпоха Ранняга Сярэднявечча, зарубінецкая культура, пражская культура, ляпная кераміка, жытло***

Па берагах р.Стыр, каля вёсак Востраў і Ласіцк сёння вядома некалькі дзесяткаў паселішчаў і месцазнаходжанняў з матэрыяламі розных перыядаў: ад каменнага веку да эпохі Сярэднявечча. Пачатак археалагічнаму вывучэнню ваколіц в.Востраў паклалі разведкі К.М. Палікарповіча ў 1940 г. [7, с. 26]. У 1960–70-х і ў пачатку 1990-х гг. у выніку планамерных даследаванняў У.Ф.Ісаенкам былі адкрыты звыш дзесятка помнікаў і месцазнаходжанняў археалагічных артэфактаў [7; 8; 9; 10; 11; 12; 13; 14]. У 1963 г. каля в.Востраў К.В.Каспарава адкрыла і даследавала паселішча зарубінецкай культуры [15]. У 1987 г. разведкі ў гэтай мясцовасці правялі А.А.Егарэйчанка і А.В.Іоў. У гэтым жа годзе на паселішчы, размешчаным за 1 км на захад ад вёскі Востраў, на левым беразе старыцы р.Стыр, ва ўр. Марфінец, А.А.Егарэйчанка правёў раскопкі на плошчы 296 м². Былі выяўлены тры пабудовы ранняга этапу пражскай культуры (канец IV – пачатак V стст.), шэраг іншых аб’ектаў [6]. У 2005 г. паверхневыя зборы на паселішчы правяла В.С.Вяргей, у 2011 г. раскопкі на плошчы 32 м² ажыццявіла аўтар [16].

У прадстаўленым артыкуле разгледжаны помнікі з матэрыяламі жалезнага веку – эпохі ранняга Сярэднявечча, размешчаныя паміж

вёскамі Востраў і Ласіцк на левым беразе р.Стыр, якія былі абследаваны аўтарам сумесна з А.Ю.Ткачовым у 2015 г.

**Востраў-3. Паселішча**[1] размешчана праз 0,8 км на ўсход ад цэнтральнай часткі в. Востраў, на выгіне левабярэжнай тэрасы р. Стыр (старарэчышча) (мал. 1). Вышыня над поплавам складае 3-4 м. Выявіў і абследаваў у 1964, 1965, 1973–1975 гг. У.Ф. Ісаенка [7; 8; 9; 10; 11]. Культурны пласт да 0,5 м. Падчас абследавання ў 1964 г. у ямах каля краю тэрасы былі заўважаны рэшткі двух жытлаў, магчыма, эпох неаліту–бронзы. На помніку былі знойдзены грубаапрацаваныя пікападобныя сякеры, наканечнікі стрэл, скрабкі, мікралітычныя вырабы, абломкі гаршкоў нёманскай культуры. Паселішча датуецца V–IV тыс. да н.э. і больш познім часам.




**Малюнак 1. - Карта помнікаў з матэрыяламі жалезнага веку – эпохі ранняга Сярэднявечча ў ваколіцах вёсак Востраў і Ласіцк, абследаваных у 2015 г. В-1 – В-8 – месцазнаходжанні Востраў-1 – Востраў-8. В-III, Л-II, Л-III – паселішчы Востраў-3, Ласіцк-2, Ласіцк-3**

---

[1] Сёння дакладна лакалізаваць помнікі каля вёсак Востраў і Ласіцк, вядомыя па выніках разведак 1940 і 1960-1970, 1990-х гг. вельмі складана, часам адзін і той жа помнік можа быць прывязаны да некалькіх вёсак адначасова (сюды яшчэ можна дадаць размешчаную недалёка вёску Вешня). Каб не ўносіць блытаніну, у артыкуле ўзгаданы толькі тыя з помнікаў, размяшчэнне якіх не выклікае ў аўтара сумневаў. У астатніх выпадках для пунктаў, агледжаных у 2015 г., у прадстаўленым артыкуле прапанавана назва “месцазнаходжанне” і нумарацыя пачынаецца з “1”. Важнай працай на перспектыву з’яўляецца лакалізацыя ўсіх помнікаў у разгледжаным мікрарэгіёне з пазначэннем геаграфічных каардынат і прысваеннем ім парадкавых нумароў.

У 2015 г. на паселішчы Востраў-3 на агаленнях глебы былі знойдзены крамянёвыя артэфакты, фрагменты ляпных пасудзін эпохі неаліту (прыпяцка-нёманская культура) і 22 сценкі пасудзін з дамешкамі розназярністай жарствы ў цесце.

**Востраў-1. Месцазнаходжанне** размешчана на паўднёвы ўсход ад вёскі Востраў (мал. 1). Паверхня разворваецца. У 2015 г. помнік агледзелі А.Ф.Касюк і А.Ю.Ткачоў, на паверхні поля, на плошчы 200 х 600 м былі сабраны крамянёвыя артэфакты, ляпная кераміка эпохі неаліту і больш позняга часу, фрагменты кругавых пасудзін эпохі позняга Сярэднявечча.

**Востраў-2. Месцазнаходжанне** размешчана праз 170 м на ўсход ад цэнтральнай часткі в. Востраў, на полі (мал. 1). У 2015 г. на агаленнях глебы былі знойдзены крамянёвыя артэфакты і тры сценкі ляпных пасудзін з дамешкай жарствы ў цесце.

**Востраў-3. Месцазнаходжанне** размешчана праз 180 м на поўнач ад в. Востраў, паміж могілкамі і фермай (мал. 1). На агаленнях глебы ў 2015 г. былі знойдзены крамянёвыя артэфакты і сценка ляпной пасудзіны з шурпатай паверхняй і дамешкай буйной жарствы ў цесце.

**Востраў-4. Месцазнаходжанне** размешчана праз 120 м на ўсход ад фермы в. Востраў, на полі (мал. 1). На агаленнях глебы ў 2015 г. былі знойдзены крамянёвыя артэфакты, 7 сценак ляпных пасудзін з дамешкай жарствы ў цесце і жалезная спражка, якая, хутчэй за ўсё, датуецца XX ст.

**Востраў-5. Месцазнаходжанне** размешчана праз 0,2-0,3 км на паўночны ўсход ад в. Востраў (ад фермы), на полі (мал. 1). На агаленнях глебы ў 2015 г. былі знойдзены крамянёвыя артэфакты і пяць сценак ляпных пасудзін.

**Востраў-6. Месцазнаходжанне** размешчана праз 0,2-0,3 км на паўночны ўсход ад в. Востраў (ад фермы), на полі (мал. 1). На агаленнях глебы ў 2015 г. былі знойдзены крамянёвыя артэфакты, 14 сценак ляпных пасудзін і сценка кругавой пасудзіны.

**Востраў-7. Месцазнаходжанне** размешчана праз 0,2-0,3 км на паўночны ўсход ад в. Востраў (ад фермы), на полі (мал. 1). На агаленнях глебы ў 2015 г. былі знойдзены крамянёвыя артэфакты і фрагменты ляпных пасудзін: 3 венцы, 38 сценак і 1 донца.

**Востраў-8. Месцазнаходжанне** размешчана праз 1,7 км на паўночны ўсход ад в. Востраў, на краі ўзвышша, на левым беразе р. Стыр (мал. 1). На агаленнях глебы ў 2015 г. былі знойдзены рэтушаваны адшчэп і сценка ляпной пасудзіны.

**Ласіцк-2. Паселішча** размешчана на захад ад вёскі Ласіцк, на першай тэрасе левага берага р. Стыр, уздоўж паўднёва–ўсходняга схілу пясчанага ўзвышша (мал. 1). Выявіў у 1965 г., абследаваў у 1975 г. У.Ф. Ісаенка. Даўжыня больш за 100 м. Знойдзены матэрыялы эпох каменю (мезаліт-неаліт) – эпохі бронзы, жалезнага веку. У 2015 г. на помніку былі знойдзены крамянёвыя артэфакты і дзве сценкі ляпных пасудзін.

**Ласіцк-3. Паселішча** размешчана праз 1,5 км на захад ад вёскі Ласіцк, у цэнтральнай частцы пясчанага ўзвышша, якое паніжаецца з поўдня на поўнач і цягнецца да в. Востраў (мал. 1). Паверхня раздуваецца. Выявіў у 1973 г., абследаваў у 1974 г. У.Ф. Ісаенка [9; 10]. У нізкай (паўночнай) частцы, на ўчастку даўжынёй 80 м знойдзена звыш 100 крамянёў з апрацоўкай (сярод іх – 12 прылад працы), 50 фрагментаў пасудзін жалезнага веку, кераміка эпохі ранняга Сярэднявечча. У паўднёва-ўсходняй частцы раздува быў знойдзены агмень, выкладзены камянямі (дыяметр развалу 4–5 м). Каля яго знойдзены фрагменты таўстасценнай ляпной пасудзіны, кавалак шліфавальнай пліткі. На ўсім помніку знойдзена да 1000 апрацаваных крэмняў, сярод іх – 90 прылад працы. Паселішча датуецца эпохай неаліту–бронзы, жалезным векам і эпохай ранняга сярэднявечча.

У 2015 г. на паверхні помніка Ласіцк-3 былі знойдзены крамянёвыя артэфакты і ляпная кераміка эпохі неаліту (ранні неаліт, прыпяцка-нёманская культура). Некалькі фрагментаў кругавых пасудзін адносяцца да эпохі позняга Сярэднявечча, таксама знойдзены адзін металургічны шлак. Кераміка I тыс. н.э. прадстаўлена 22 венцамі, 191 сценкай, 4 донцамі (мал. 2). Фрагменты пасудзін вельмі дробныя, абкатаныя, таўшчыня сценак да 1 см. У гліняным цесце прасочваецца дамешка дробнай жарствы, і, верагодна, пяску. Паверхня пасудзін шурпатая, гладкая і падглянцаваная. Колер чырвоны, шэры, карычневы, часам плямісты. Шмат на якіх фрагментах маюцца сляды зярновак.

Культурна-храналагічная сітуацыя ў сярэднім цячэнні Прыпяці ў I тыс. н.э. была наступная: на рубяжы эр – да сярэдзіны I ст. н.э. тут пражывалі носьбіты зарубінецкай культуры. У сярэдзіне I – на рубяжы II/III ст. існавалі помнікі тыпу Курадава, якія спалучалі ў сабе рысы палескага варыянту зарубінецкай культуры і кола “гарадзішчанскіх” культур усходнееўрапейскай лясной зоны і з’яўляліся часткай постзарубінецкага культурна-гістарычнага гарызонту [2]. Іх існаванне перарвалася ў сувязі з прасоўваннем у Цэнтральнае Палессе германцаў – носьбітаў вельбарскай культуры [1]. Наступны гістарычны этап звязаны з славянскім насельніцтвам пражскай культуры, матэрыялы якой

зафіксаваны на паселішчах Лапаціна, Ласіцк на р. Стыр; Астроўчыцы, Мерчыцы-2 на р. Ясельда; Курадава-1-3 на р. Прыпяць; Сошна на р. Вісліца (прыток р. Бобрык) [3]. На паселішчы Востраў-2 атрыманы ўнікальныя матэрыялы перыяду фарміравання пражскай культуры: у жытле 3 зафіксавана раннеславянская кераміка пражскага тыпу са знаходкамі познерымскага часу [5; 6].




**Малюнак 2. - Венцы (1-17) і донцы (18-19) ляпных пасудзін жалезнага веку і эпохі ранняга Сярэднявечча з паселішча Ласіцк-3. Малюнак А.Ф.Касюк**

На ўсіх агледжаных у 2015 г. помніках матэрыялы жалезнага веку – эпохі ранняга Сярэднявечча з павярховых збораў прадстаўлены дробнымі фрагментамі ляпных пасудзін. Найбольш прадстаўнічая калекцыя была атрымана на паселішчы Ласіцк-3. Ляпныя пасудзіны мелі

адхіленыя вонкі венцы з прама зрэзаным, закругленым ці патончаным краем. На адным венцы нанесена скразная арнаментальная адтуліна акруглай формы. Донцы пасудзін маюць плаўны пераход у сценкі. Сярод керамікі прысутнічаюць фрагменты пасудзін зарубінецкай культуры (сценкі з гладкай і падглянцаванай паверхнямі), постзарубінецкага культурна-гістарычнага гарызонту і пражскай культуры. Такім чынам, матэрыялы з абследаваных паселішчаў сведчаць аб шчыльнай заселенасці гэтага рэгіёну ў жалезным веку і раннім Сярэднявеччы.

1. Белевец, В.Г. Контакты населения вельбарской культуры и носителей традиции восточноевропейской лесной зоны в Белоруссии: постановка проблемы / В.Г. Белевец // Лесная и лесостепная зоны Восточной Европы в эпохи римских влияний и Великого переселения народов. Вып. 1: Сб. статей/ И.Р. Ахмедов, И.О. Гавритухин, А.М. Воронцов и др. Предисл. А.М. Воронцов, И.О. Гавритухин; под ред. А.Н. Наумова. – Тула: Гос. Музей-заповедник «Куликово поле», 2008. – С. 209–237.

2. Белявец В.Г. Стан і актуальныя праблемы вывучэння помнікаў постзарубінецкага гарызонту ў Беларускім Палессі // Славяне на территории Беларуси в догосударственный период: к 90-летию со дня рождения Л. Д. Поболя. 2-е изд., испр. Перераб. И доп. 1. / Ред. О.Н. Левко, В.Г. Белевец. Минск: Беларуская навука. 2019. – С. 345-394.

3. Вяргей, В.С. Помнікі тыпу Прагі-Карчак і Лука-Райкавецкай культуры / В.С. Вяргей // Археалогія Беларусі: у 4 т. / рэдкал.: М.В. Біч (старшыня) [і інш.]. – Мінск: Беларуская Навука, 1998–2001. – Т. 2: Жалезны век і ранняе сярэднявечча / В.І. Шадыра [і інш.]. – 1999. – С. 317–337.

4. Вяргей, В.С. Справаздача аб палявых даследаваннях у Петрыкаўскім раёне Гомельскай вобласці на археалагічным комплексе каля в.Снядзін у 2005 годзе / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 2290.

5. Гавритухин, И.О. Комплексы пражской культуры с датирующими вещами / И.О. Гавритухин // Arceheologia o początkach Słowian: матэрыялы міжнароднай канферэнцыі, Кракаў 19–21 лістапада 2001 г. / рэдкал.: P. Kaczanowski, M. Parczwski. – Krakyw: IAUJ, 2005. – S. 403–461.

6. Егорейченко, А.А. Поселение у д. Остров Пинского р–на Брестской области / А.А. Егорейченко // Arhaeoslavica. – Kraków, 1991. – № 1. – С. 61–82.

7. Исаенко В.Ф. Отчёт о полевых исследованиях за 1964 год / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 233, 233а.

8. Исаенко В.Ф. Отчёт о полевых исследованиях 1965 года / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 258.

9. Исаенко В.Ф. Отчёт о полевых исследованиях в Витебской области и на территории Полесья в 1973 г. / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 442.

10. Исаенко В.Ф. Отчёт о полевых исследованиях в 1974 году (Полесье, Кареличский, Зельвенский район Гродненской области) / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 475.

11. Исаенко В.Ф. Отчёт Полесского неолитического отряда о полевых работах 1975 года / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 521.

12. Исаенко В.Ф. Неолит Припятского Полесья / В.Ф. Исаенко; ред. д-р ист. наук Д.Я. Телегин. – Мн.: Наука и техника, 1976. – 128 с.

13. Исаенко В.Ф. Список первобытных археологических памятников Полесья 1989 г. / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 1356.

14. Исаенко, В.Ф. Отчёт о полевых исследованиях Припятского отряда в 1991 году / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 1469.

15. Каспарова, К.В. Отчёт о работе Белорусского отряда Государственного Эрмитажа в 1963 г. / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 247.

16. Касюк, А.Ф. Асноўныя вынікі археалагічных даследаванняў на Палессі ў 2011 г. // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Вып. 24. – Даследаванне сярэдневяковых старажытнасцей Цэнтральнай Беларусі (памяці Ю.А. Заяца) – Мн., 2013. – С. 355–361.

## THE SETTLEMENTS OF THE IRON AGE – THE EARLY MIDDLE AGES NEARBY OF THE VILLAGES LASICK AND VOSTRAŬ IN THE PINSK DISTRICT ACCORDING TO THE RESULTS OF THE ARCHAEOLOGICAL RESEARCH IN 2015

***Alena F. Kasiuk***
*Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus,*
*Minsk, Belarus*
*kasiuk2585@gmail.com*

Summary: this article is devoted to the preliminary results of archaeological research which were carried out by the author together with A.Y.Tkačoŭ in 2015 on settlements with materials of the Iron Age – the Early Middle Ages nearby of the villages Lasick and Vostraŭ on the Styr River in the Pinsk district of the Brest region. Analysis of the collected materials and their cultural and chronological interpretation is presented.

***Keywords: archeology, Pinsk district, Iron Age, Early Middle Ages, Zarubinetskaja culture, Prague culture, hand-made pottery dwelling***